Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

**УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ**

вул. Ажэшкі, 3, 230023, г. Гродна
тэл. (0152) 73 80 53, факс 71 73 06
эл. пошта: grodnooblkult@mail.grodno.by

Гродненский областной
исполнительный комитет

**УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ**

ул. Ожешко, 3, 230023, г. Гродно
тел. (0152) 73 80 53, факс 71 73 06
эл. почта: grodnooblkult@mail.grodno.by

07.04.2021 № 01-13-06/637-3

На № ад

Упраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта разгледзела Ваш зварот, накіраваны з Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, па пытанні працоўных адносін з супрацоўнікамі ўстановы культуры “Навагрудскі гістарычна-краязнаўчы музей” і паведамляе наступнае.

Па інфармацыі аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама тэрмін дзеяння кантракту з Кавальчук Г.Т. скончыўся 22.03.2021, з Вяршыцкай Т.Р. – 03.04.2021. Наймальнік паведаміў вышэйзгаданым супрацоўнікам аб звальненні ў сувязі з заканчэннем тэрмінаў дзеяння кантрактаў ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны – 15.02.2021.

Законных падстаў, якія перашкаджаюць звальненню Вяршыцкай Т.Р., Кавальчук Г.Т. у сувязі з заканчэннем тэрмінаў дзеяння кантрактаў (п. 2 арт. 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) няма.

Музей яўрэйскага супраціву ў Наваградку з’яўляецца экспазіцыяй установы культуры “Навагрудскі гістарычна-краязнаўчы музей”, які стабільна функцыянуе, развіваецца, праводзіць навукова-даследчую і экскурсійную дзейнасць. У музеі ёсць кваліфікаваны спецыяліст, які валодае неабходнымі ведамі па гісторыі яўрэйскага супраціву ў Наваградку і англійскай мовай на прафесійным узроўні. У жніўні 2021 года музей папоўніцца маладымі спецыялістамі.

Музей яўрэйскага супраціву ў Наваградку працягне працу па захаванні памяці беларускага народа аб Халакосце, не страціць сваё ўнікальнае значэнне, застанецца крыніцай ведаў і разумення трагічных гістарычных падзей Другой сусветнай вайны.

Дадзены адказ Вы можаце абскардзіць у судовым парадку.

Начальнік А.В.Клімовіч